947.6
Р 93

Установа адукацыі
"БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА"

УДК 947.6 "1917"

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч**

# СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ВЫРАШЭННІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ І ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ (сакавік — кастрычнік 1917 г.)

07.00.02 — айчынная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Мінск — 2006

Работа выканана ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт"

Навуковы кіраўнік — доктар гістарычных навук, дацэнт Сяменчык М. Я. (установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт", кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі)

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Сарокін А. М. (прыватная ўстанова адукацыі "БІП – Інстытут правазнаўства", кафедра тэорыі і гісторыі права)

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Багдановіч А. Г. (Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт, кафедра гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры)

Апаніруючая арганізацыя — установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П. М. Машэрава"

Абарона адбудзецца 27 чэрвеня 2006 г. у 16.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый К 02.21.03 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18, аўд. 482; тэл. вучонага сакратара: 200-82-53.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка".

Аўтарэферат разасланы "26" мая 2006 г.

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый — І. І. Багдановіч

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Задачы пабудовы моцнай і квітнеючай Беларусі настойліва патрабуюць мабілізацыі ўсіх сіл грамадства, у тым ліку выкарыстання вопыту папярэдніх пакаленняў. З набыццём і ўмацаваннем суверэнітэту ўзнікае патрэба ў аб’ектыўнай і ўсебаковай гісторыі беларусаў, і, у першую чаргу сялянства як стваральніка вызначальных матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей нацыі. Відавочна, што адмысловае, заснаванае на сучасных метадалогіі і метадах даследавання грамадска-палітычных, эканамічных, ментальна-псіхалагічных асаблівасцей яго жыццядзейнасці на лёсавызначальных этапах айчыннай і еўрапейскай гісторыі паспрыяе нацыянальна-дзяржаўнаму яднанню ўсяго беларускага народа. Як паказвае аналіз айчыннай гістарыяграфіі, зараз асобныя аспекты беларускай гісторыі ў іх марксісцка-ленінскай трактоўцы не выконваюць сваіх адукацыйных і выхаваўчых функцый. У значнай меры такое становішча ўласціва асвятленню падзей 1917 г. У гэтай сувязі наспела мэтазгоднасць і магчымасць вывучэння мінуўшчыны на аснове новай метадалогіі, заснаванай на прынцыпах гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці.

Зварот да тэмы жыццядзейнасці народа на пераломных этапах гісторыі ўяўляецца нам асабліва своечасовым зараз, у нашы дні, калі ў шэрагу краін адбыліся так званыя “каляровыя” рэвалюцыі. Аналіз тых падзей, акрамя іншага, сведчыць аб тым, што палітычныя дзеячы часам забываюцца на ўрокі 1917 года, не надаючы патрэбнай увагі эканамічным пытанням, сацыяльнай сферы, барацьбе са злачыннасцю, умацаванню дзяржаўных інстытутаў і інш.

Нарэшце, у сувязі з распачатай дзяржаўнай праграмай па адраджэнні вёскі лічым актуальным і важным распрацоўку фундаментальнай грамадазнаўчай тэмы, у тым ліку па гісторыі беларускага сялянства ў 1917 г.

***Сувязь працы з навуковымі праграмамі, тэмамі.*** Даследаванне адбывалася па ініцыятыве аўтара ў межах тэмы кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ “Грамадскія аб’яднанні і рухі XX стагоддзя на Беларусі”. Тэма дысертацыі была зацверджана Саветам БДТУ 28 лютага 2006 г. (пратакол № 6).

***Мэта і задачы даследавання.*** Мэтай даследавання з’яўляецца асвятленне і характарыстыка асноўных форм удзелу сялянства неакупіраванай кайзераўскімі войскамі Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы ў перыяд з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

Зыходзячы з вызначанай мэты, у рабоце вырашаюцца наступныя задачы:

- паказваюцца мэты, формы і вынікі абвяшчэння сялянства аб перамене ўлады і іншых падзеях у краіне; яго настроі і паводзіны з гэтай нагоды;
- раскрываецца роля сялянства ў стварэнні і дзейнасці новых органаў улады (валасных камітэтаў, камісарыятаў) і мясцовага самакіравання (земстваў);
- асвятляюцца асаблівасці ўтварэння сялянскіх арганізацый, напрамкі і формы іх дзейнасці, месца ў сістэме іншых грамадска-палітычных структур;
- паказваецца ўдзел сялянства Беларусі ў зборы сродкаў на патрэбы арміі і падпісцы на аблігацыю Пазыкі Свабоды;

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага
...ялагічнага універсітэта

■ разглядаюцца асаблівасці развіцця сялянскай гаспадаркі Беларусі пад уздзеяннем зямельных камітэтаў;

■ характарызуецца стаўленне сялянства Беларусі да ўрадавай харчовай палітыкі ва ўмовах хлебнай манаполіі на розных этапах грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам даследавання з'яўляецца грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё народаў Расійскай імперыі (рэспублікі) у перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Прадметам — удзел сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы пасля звяржэння самадзяржаўя да перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

***Храналагічныя рамкі.*** Дысертацыя ўключае перыяд з лютага па кастрычнік (уключна) 1917 г., ад пачатку Лютаўскай рэвалюцыі да ўсталявання Савецкай улады на Беларусі і Заходнім фронце.

***Метадалогія і метады даследавання.*** Метадалагічнай асновай даследавання з'яўляецца сукупнасць прынцыпаў гістарызму, навуковасці і аб'ектыўнасці, што дазваляе ўсебакова і комплексна вырашаць азначаныя падзеі і працэсы ў іх развіцці, паслядоўнасці, сувязі і пераемнасці. Для дасягнення мэты выкарыстоўваліся канкрэтна-гістарычныя (праблемна-храналагічны, гісторыка-генетычны, апісальны, параўнальны, сістэмны, тыпалагічны) і агульнанавуковыя метады (індукцыі, дэдукцыі, сінтэзу, аналізу і інш.). Для характарыстыкі сялянскай жыццядзейнасці напярэдадні і пасля рэвалюцый спатрэбіўся параўнальна-супастаўляльны метад. З прычыны наяўнасці шматлікіх колькасных дадзеных, змешчаных у дакументах, аўтарам выкарыстаны метад статыстычнага аналізу. Метадам контэнт-аналізу даследаваны шматлікія дырэктывы, справаздачы, данясенні ўладных устаноў, што дало магчымасць аб'ектыўна ахарактарызаваць аграрную і харчовую палітыку ўрада і выявіць стаўленне да яе сялянства.

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.*** Выкананая праца ўяўляе сабой першае комплекснае даследаванне ўдзелу сялянства Беларусі ў вырашэнні праблем грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця Расійскай дзяржавы на этапе падрыхтоўкі да рэформ і склікання Устаноўчага сходу. Упершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы здзейснена спроба аб'ектыўнага асвятлення ўдзелу сялянства ў працэсе стварэння і дзейнасці органаў улады. Упершыню зроблена спроба аб'ектыўнага асвятлення вызначальных прычын і матываў сялянскага руху, ступені яго палітызацыі. Практычна ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі даследавана дзейнасць харчовых і зямельных камітэтаў, іх уплыў на сялянскі рух; удзел сялянства ў ажыццяўленні ўрадавай хлебнай манаполіі, дабрачынных мерапрыемствах на карысць арміі, падпісцы на аблігацыі Пазыкі Свабоды.

Матэрыялы даследавання спрыяюць пераадоленню палітызаваных стэрэатыпаў, у тым ліку адносна характарыстыкі сацыяльных паводзін сялянства Беларусі пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі, яго ролі ў вырашэнні палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы. У навуковае абарачэнне ўключана

вялікая, большай часткай не выкарыстаная раней, колькасць архіўных і іншых матэрыялаў па пытаннях, азначаных у плане даследавання, у выніку чаго гісторыя Беларусі 1917 г. узбагачаецца многімі фактамі і высновамі, якія істотна мяняюць існуючыя ўяўленні аб ёй.

***Практычная значнасць атрыманых вынікаў.*** Вынікі працы могуць прынесці карысць пры падрыхтоўцы краязнаўчых і энцыклапедычных даведнікаў, навучальных дапаможнікаў і падручнікаў для вышэйшай школы па гісторыі Беларусі і Расіі. Фактычны і статыстычны матэрыял, звесткі аб сялянстве і інш. можа быць выкарыстаны для падрыхтоўкі лекцый, спецкурсаў і семінараў па сацыяльна-эканамічных, грамадска-палітычных і іншых аспектах рэвалюцый 1917 г. Навуковы зварот да вывучэння сялянства Беларусі адпавядае сацыяльнай запатрабаванасці асвятлення праблем эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага развіцця беларускага народа ў кантэксце гісторыі Расійскай дзяржавы на пераломным этапе яе развіцця, якім з'яўляліся рэвалюцыі 1917 г. Менавіта на прыкладзе рэвалюцыйных пераўтварэнняў найбольш яскрава можна прасачыць еднасць інтарэсаў усіх хлебаробаў, незалежна ад нацыянальнасці, а таксама яшчэ раз пацвердзіць наяўнасць трывалых гістарычных сувязеў народаў Расіі і Беларусі. Мяркуем таксама, што ва ўмовах ажыццяўлення дзяржаўнай праграмы па адраджэнні беларускага сяла праведзенае даследаванне будзе спрыяць узрастанню яе маральнай падтрымкі з боку ўсяго грамадства.

***Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:***

1. Абвяшчэнне сялян аб утварэнні Часовага ўрада і адрачэнні Раманавых адбывалася арганізавана, як правіла, сіламі земскіх служачых і павятовых камісараў на сельскіх і валасных сходах, а таксама святарамі ў час набажэнстваў. Асноўнай мэтай гэтай працы з'яўлялася ўкараненне ў сялянскую свядомасць пераканання ў тым, што сіламі Дзяржаўнай думы, арміі і народа ў краіне ўсталявана новая, законная ўлада ў асобе Часовага ўрада, якую неабходна падтрымліваць усімі сіламі. Вынікам намаганняў з'явілася прадухіленне разрастання аграрных парушэнняў, захаванне сялянамі правапарадку і звычайнай жыццядзейнасці, падтрымка мерапрыемстваў новых органаў улады.

2. З наданнем грамадзянам Расіі палітычных правоў і свабод сялянства ператварылася ў самы масавы сацыяльны пласт, здольны ва ўмовах дэмакратызацыі грамадскага жыцця вызначаць склад уладных структур і органаў самакіравання. Але па прычыне нізкай адукацыі (ці яе адсутнасці), неразвітасці класавай свядомасці і інш. актыўнасць сялян у абранні і дзейнасці дзяржаўных органаў і земстваў выявілася галоўным чынам на валасным узроўні. У сваёй масе па метаду фарміравання, складу, характару дзейнасці валасныя выканаўчыя, харчовыя, зямельныя камітэты з'яўляліся дэмакратычнымі ўстановамі.

3. З прычыны неразвітай палітычнай культуры сяляне Беларусі не выказвалі патрэбы ў стварэнні грамадска-палітычных арганізацый. Узнікненне суполак Сялянскага саюза, Саветаў сялянскіх дэпутатаў і інш. адбывалася па ініцыятыве грамадскіх, урадавых і партыйных дзеячаў, галоўным чынам, у мэтах прыпынення аграрнага руху, дэмакратызацыі органаў улады, выканання пастаноў

Часовага ўрада і яго мясцовых органаў і інш. З узрастаннем палітызацыі грамадства Саветы сялянскіх дэпутатаў ператварыліся ў інструмент барацьбы за ажыццяўленне партыйных задач іх кіраўнікоў. У параўнанні з валаснымі, харчовымі і зямельнымі камітэтамі зацікаўленасць сялян Беларусі дзейнасцю сваіх Саветаў, за выключэннем Магілёўскай губ., была невысокай.

4. Пасля звяржэння царызму мэты, формы і вынікі ўдзелу беларускіх сялян у зборы сродкаў на карысць франтавікоў істотна не змяніліся. Гэтая дзейнасць, у адрозненне ад іншых відаў дабрачыннасці, мела масавы характар і адчувальныя вынікі. Па меры ўзмацнення ў грамадстве антываенных настрояў і крызісных з'яў, яна набывала тэндэнцыю да зніжэння і зусім прыпынілася пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі. Збор сродкаў сялянамі Беларусі ў фонд абароны краіны шляхам падпіскі на аблігацыю Пазыкі Свабоды перавышаў дасягненні іншых сацыяльных пластоў, грамадскіх арганізацый, царквы, устаноў асветы і г. д. У адрозненне ад папярэдніх дзяржаўных ваенных пазык, падпіска беларускага сялянства на Пазыку Свабоды была масавай і выніковай.

5. Заснаваныя Часовым урадам зямельныя камітэты як дзяржаўныя органы для ўрэгулявання спрэчных пытанняў ва ўзаемаадносінах паміж землеўладальнікамі, арандатарамі, земляробамі, рабочымі і г. д., а таксама для падрыхтоўкі аграрнай рэформы, не атрымалі адпаведнай заканадаўчай базы і, па сутнасці, ператварыліся ў інструмент эсэраўскай палітыкі. Аб'ектыўна гэта палітыка адпавядала тагачасным інтарэсам сялянства. Дзякуючы валасным зямельным камітэтам, якія ў сваёй падаўляючай большасці складаліся з сялян, вясковыя грамадствы Беларусі арганізавана, у сваіх мэтах ажыццяўлялі нарыхтоўку лесаматэрыялаў, дроў, выкарыстоўвалі лясныя ўгоддзі для пасьбы жывёлы і г. д., а таксама пуставаўшыя прыватнаўласніцкія і казённыя участкі для азімых пасеваў. Летам-восенню пад уздзеяннем у сваёй большасці валасных зямельных камітэтаў беларускія сяляне ўсе часцей заяўлялі аб сваіх правах на казённыя, царкоўныя, арэндныя і нават хутарскія ўладанні. Да гэтага часу наспела аб'ектыўная неабходнасць заканадаўчай перадачы ўсёй зямельнай (у тым ліку лясной) маёмасці ў распараджэнне зямельных камітэтаў, паколькі ў тых умовах падрыхтоўка да аграрнай рэформы стала набываць прыкметы яе стыхійнага ажыццяўлення сіламі саміх сялян. З прыходам да ўлады бальшавікоў ажыццяўленне аграрнай рэформы адбывалася на аснове аграрнай праграмы Партыі сацыялістаў-рэвалюцыйнераў (ПС-Р) і з апорай на зямельныя камітэты.

6. Пасля звяржэння самадзяржаўя харчовая палітыка Часовага ўрада знайшла ў беларускага сялянства спачуванне і падтрымку. Разам з тым абвешчаная ім закупка збожжа новага ўраджаю ва ўмовах хлебнай манаполіі ў беларускай вёсцы не стымулявала сялянскай актыўнасці з-за істотнага разыходжання цвёрдых і рыначных цэн. Па меры ўзрастання попыту на сельска-гаспадарчую прадукцыю, дзякуючы сялянскаму складу валасных харчовых камітэтаў, на вёсцы распачаўся перагляд (на карысць земляробаў) кантрактаў на пастаўкі фуражу, умоў арэнды зямлі і аплаты працы. На Беларусі недальнабачная эканамічная палітыка ўрада (павышэнне закупачных цэн, зніжэнне норм

спажывання, аслабленне цэнтралізаванага забеспячэння і інш.) прывяла да таго, што сяляне пераставалі лічыцца з дзяржаўнымі і грамадскімі патрэбамі і імкнуліся перш за ўсё абараніць уласныя інтарэсы. У выніку сялянскія пастаўкі хлеба па рэквізіцыях спыніліся пры адначасовым узмацненні яго продажу скупшчыкам і камерцыйнай перапрацоўкі ў спіртавыя напоі. З усталяваннем Савецкай улады харчовае забеспячэнне фронта і гарадоў яшчэ больш пагоршылася.

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай даследчай работай, якая напісана на аснове архіўных крыніц і матэрыялаў перыядычнага друку 1917 г., галоўным чынам, упершыню ўведзеных у навуковае абарачэнне, а таксама гістарычнай літаратуры. Новыя падыходы і метады іх вырашэння, абраныя аўтарам, з вялікай доляй дакладнасці дазволілі рэканструяваць жыццядзейнасць беларускага сялянства ва ўмовах палітычнага і эканамічнага рэфармавання Расійскай дзяржавы.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Палажэнні і высновы дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ. Вынікі працы агучваліся ў выступленнях дысертанта на Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Гістарычнае пазнанне — важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI стагоддзя" (29 лістапада 2002 г., Мінск), Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі "Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя" (18-19 красавіка 2003 г., Мінск), III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць" (22-23 мая 2003 г., Магілёў), Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі" (28 лістапада 2003 г., Мінск), Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў "НДРС–2003" (9-10 снежня 2003, Мінск), навуковых чытаннях з нагоды 85-годдзя з дня нараджэння акадэміка НАН Беларусі І.М. Ігнаценкі (28 снежня 2004 г., Мінск), 68-й міжнароднай навукова-тэхнічнай канферэнцыі БДТУ (Мінск, 2004), Міжнароднай навуковай канферэнцыі "XXI стагоддзе: актуальныя праблемы гістарычнай навукі" (15-16 красавіка 2004 г., Мінск), IX Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў Беларусі "НДРС-2004" (26-27 мая 2004 г., Гродна), Міжнароднай навуковай канферэнцый маладых вучоных "Моладзь у навуцы 2004" (8-12 лістапада 2004 г., Мінск), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Актуальныя праблемы новай і навейшай гісторыі Еўропы і ЗША" (31 сакавіка 2005 г., Мінск), Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Першая Расійская рэвалюцыя: прычыны, ход, наступствы" (27 кастрычніка 2005 г., Мінск).

***Апублікаванасць вынікаў.*** Дысертантам апублікавана 14 прац, у тым ліку 5 артыкулаў у навуковых часопісах, 7 артыкулаў і 2 тэзісы дакладаў у матэрыялах канферэнцый. Агульны аб'ём публікацый складае 56 старонак.

***Структура і аб'ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 3 глаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 137 старонак, з іх дадаткі — 8 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 655 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва ***“Уводзінах”*** раскрываецца сучасны стан распрацоўкі праблемы і акрэсліваецца наспеласць яго навуковага даследавання. Даецца асвятленне жыццядзейнасці сялянства неакупіраваных беларускіх губерняў напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі. Акрэсліваецца шэраг праблем, абраных для вывучэння.

У ***“Агульнай характарыстыцы работы”*** раскрываецца актуальнасць тэмы дысертацыі, акрэсліваецца сувязь працы з навуковымі праграмамі і тэмамі, вызначаюцца яе мэты і задачы, аб’ект і прадмет даследавання, метадалогія і метады яе правядзення. Фармулюецца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў, акрэсліваюцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Адзначаецца асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

У першай главе ***“Гістарыяграфія і крыніцы”*** характарызуюцца стан вывучэння праблемы і крыніцазнаўчай базы даследавання.

З першых год станаўлення савецкай гістарычнай навукі ў працах, прысвечаных Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыям, дамінавала рабочая і салдацкая праблематыка, а тэма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, у тым ліку становішча сялянства, яго ўдзелу ў рэвалюцыйных пераменах, на доўгія гады набыла другаступенны, фонавы характар. У ліку першых айчынных аўтараў, хто звярнуўся да гісторыі Беларусі часу рэвалюцый 1917 г., былі Я.С. Канчар[1], Ф.Ф. Турук[2], В.Г. Кнорын[3], Г. Лялевіч[4] і інш.[5] Сялянская тэматыка пэўным чынам адбілася ў працах маскоўскіх і ленінградскіх аўтараў — Н.Д. Кандрацьева, Г.С. Гардзеева, З. Лазінскага[6], якія займаліся эканамічнымі праблемамі Расійскай дзяржавы часу Першай сусветнай і грамадзянскай вайны. Большасці іх, асабліва працам С.М. Дуброўскага і А.В. Шастакова[7], характэрны дастаткова ўзважаны, “небальшавізаваны” погляд на сялянскі рух у Расіі.

З замацаваннем сталінскіх метадаў кіраўніцтва навукай вывучэнне гісторыі Беларусі 1917 г. запаволілася і ўсё больш ідэалагізавалася, што, у прыватнасці, адбілася ў творах — А.І. Зюзькова, Ц.С. Гарбунова, І.І. Саладкова[8]. Нават з пачаткам хрушчоўскай “адлігі” манаграфіям беларускіх навукоўцаў — Ф.А. Зеляноўскага[9], Е.П. Лук’янава[10], І.Я. Марчанкі[11], у якіх асвятлялася жыццядзей-

[1] Канчер Е.С. Белорусский вопрос. Сб. статей — Петроград: Комиссариат по делам национальностей. Белорусский отдел, 1919.— 132 с.

[2] Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов.— М.: Госиздательство, 1921.— 140 с.

[3] Кнорин В. Революция и контрреволюция в Белоруссии — Смоленск: Полит. партии Литвы и Белоруссии, 1928. — Ч. 1.— 64 с.

[4] Лелевич Г. Из истории крестьянского движения в Могилевской губернии накануне Октябрьской революции // Пролетарская революция.— 1922.— № 11.— С. 116—126.

[5] Беларусь: нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху / Пад рэд. А. Сташэўскага.— Мінск: Выд. Цэнтр. Выканкам БССР, 1924.— 321 с.

[6] Кондратьев Н.Д. Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции.— М.: Наука, 1922. — 486 с.; Гордеев Г.С. Сельское хозяйство в войне и революции.— М.-Л.: Госиздат-во, 1925.— 208 с.; Лозинский З. Экономическая политика Временного правительства.— Л.: Прибой, 1929.— 200 с.

[7] Дубровский С.М. Крестьянство в 1917 г. Факсимильное издание.— 1983. Michigan U. S. A.— М-Л.: Госиздат, 1927.— 146 с.; Шестаков А.В. Большевики и крестьянство в революции 1917 г.— М.: Госиздат, 1927. — 89 с.

[8] Зюзькоў А.І. Бальшавікі — арганізатары Кастрычніка ў Беларусі.— Мінск: Партыйнае выдавецтва, 1934.— 94 с.; Горбунов Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве.— М.: ОГИЗ, 1948.— 232 с.; Саладков И.И. Большевики Белоруссии в период подготовки и проведения Великой Октябрьской социалистической революции.— Минск: Учпедгиз БССР. 1957.— 341 с.

[9] Зеленовский Ф.А. Большевики Белоруссии в борьбе за союз рабочего класса и беднейшего крестьянства в период подготовки Великой Октябрьской социалистической революции.— Гомель: Мин-во просвещения БССР, ГГПИ им. Чкалова, 1957.— 105 с.

[10] Лукьянов Е.П. Крестьянское движение в Белоруссии накануне Великой Октябрьской социалистической революции.— Минск: Госиздат, 1958.— 176 с.

[11] Марченко И.Е. Аграрные преобразования в Белоруссии в 1917—1918 гг.— Минск: Госиздат БССР, 1959.— 162 с.

насць беларускай вёскі, быў уласцівы партыйна-класавы падыход да ацэнкі Саветаў і ўрадавых органаў з удзелам сялян. Тая ж тэндэнцыя адбілася ў працах маскоўскіх і ленінградскіх гісторыкаў П.Н. Собалева, А.М. Анфімава, П.В. Валабуева[12], якія, акрамя іншага, акцэнтавалі ўвагу на бальшавіцкім уплыве сярод сялян. У гэтым сэнсе пэўны адыход ад перабольшвання ролі РСДРП (б) у сялянскіх арганізацыях выявіў І.М. Ігнаценка на старонках сваёй манаграфіі 1962 г.[13] У астатнім аўтар заставаўся ў рэчышчы панаваўшых на той час метадалагічных падыходаў, у выніку чаго палітыка Часовага ўрада, дзейнасць эсэраў і іншых небальшавіцкіх партый на Беларусі асвятляліся выключна негатыўна. Настроі і паводзіны сялянства як асобнай сацыяльнай супольнасці з яго ўласнымі гаспадарчымі, грамадскімі, палітычнымі і іншымі інтарэсамі, па сутнасці, так і не разглядаліся. У ліку тых гісторыкаў, хто займаўся эканамічным аспектам беларускай вёскі часоў Першай сусветнай вайны, быў Л.П. Ліпінскі[14], але гаспадарчая жыццядзейнасць беларускіх земляробаў у 1917 г. спецыяльна не разглядалася. Беларускі даследчык Э.М. Савіцкі таксама разглядзіў толькі першы месяц Лютаўскай рэвалюцыі[15]. І.М. Ігнаценка ў сваёй чарговай манаграфіі “Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии”[16] адносна азначанай праблематыкі толькі паўтарыў палажэнні свайго асноўнага твора — “Беднейшее крестьянство...”. І надалей стан вывучэння сялянскай тэматыкі заставаўся практычна нязменным, калі не лічыць манаграфіі П.К. Башко[17], дзе прыводзіліся абагульненыя звесткі аб сялянскіх арганізацыях.

У працах расійскіх аўтараў пачатку 1980-х гг. В.І. Кастрыкіна[18], Т.М. Кітанінай[19], А.Д. Маляўскага[20] і Т.В. Осіпавай[21] з партыйна-класавых пазіцый даецца шматгранная характарыстыка сацыяльна-эканамічнага становішча Расіі, у тым ліку становішча сялянства.

З разгортваннем перабудовы працы замежных аўтараў, у тым ліку дзеячаў, апазіцыйных бальшавізму, сталі вядомы больш шырокаму колу гісторыкаў. Іншая справа, што Е. Кар, М. Рэн, Л. Волін, Л. Оўэн, Дж. Джыл, Р. Пайпс[22] не разглядалі беларускае сялянства асобна ад рускага. Такая ж рыса ўласціва мемуарам А.І. Дзянікіна, А.Ф. Керанскага, П.Г. Курлова, П.В. Мілюкова[23],

---

[12] Соболев П.Н. Беднейшее крестьянство союзник пролетариата в Октябрьской революции.— М.: Госполитиздат, 1958.— 340 с.; Анфимов А.М. Российская деревня в годы первой мировой войны (1914—1917 гг.).— М.: Соц экгиз, 1962.— 383 с.; Волобуев П.В. Экономическая политика Временного правительства.— М.: Изд. Академия наук СССР, 1962.— 483 с.

[13] Игнатенко И.М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии.— Минск: Министерство высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962.— 500 с.

[14] Липинский Л.П. Лукьянов Е.Л. Крестьянское движение в Белоруссии в период между двумя революциями.— Минск: Наука и техника, 1964.— 258 с.; Липинский Л.П. Крестьянское движение в Белоруссии в 1914—1917 гг.— Минск: Изд-во БГУ, 1975.— 184 с.

[15] Савицкий Э.М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914—февраль 1917 гг.).— Минск: Наука и техника, 1981.— 182 с.

[16] Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция.— Минск: Наука и техника, 1986.— 344 с.

[17] Башко П.К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март—октябрь 1917 г.).— Минск: Наука и техника, 1987.— 254 с.

[18] Кострикин В.И. Земельные комитеты в 1917 г.— М.: Наука, 1975.— 336 с.

[19] Китанина Т.М. Война, хлеб и революция. (продовольственный вопрос в России 1914—октябрь 1917 г.).— Л.: Наука, 1985.— 384 с.

[20] Малявский А.Д. Крестьянское движение в России в 1917 г. (март—октябрь).— М.: Наука, 1981.— 400 с.

[21] Осипова Т.В. Классовая борьба в деревне в период подготовки и проведения Октябрьской революции.— М.: Наука, 1974.— 350 с.

[22] Carr E.H. The Russian Revolution from Lenin to Stalin 1917-29. — Macmillan, 1979.— 216 p.; Gill G. Peasants and Government in the Russian revolution.— L., 1979.; Maynard G. The Russian Peasant and Other Studies — N. Y. 1967.— 484 p.; Owen L. The Russian peasant movement 1906-1917.— N. Y: Мова-Е, 1964.— 267 p.; The Russian peasantry: The world the peasants made / By David Moon. London. N. Y.: Addison Wesley, Longman Ltd. 1999.— 369 p.; Volin L. Progress in modernization. The agrarian situation was improving in imperial Russia after 1861.— N. Y., 1965.; Wren M. The Course of Russian History.— N. Y.: Мова-Е, 1958.— 779 p.

[23] Керенский А.Ф. Россия на историческом повороте. Мемуары.— М.: Республика. 1993.— 383 с.; Милюков П.В. Воспоминания // Страна гибнет сегодня. Воспоминания о Февральской революции 1917 г.— М.: Книга, 1991.— 480 с.; Курлов П.Г. Гибель императорской России.— М.: Современник, 1992.— 256 с.

У.М. Друцкага-Сакалінскага[24], тым не менш, працы апошніх больш набліжаны да тагачасных рэалій і менш тэндэнцыйна асвятляюць палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы Расіі 1917 г.

У Расійскай Федэрацыі з адыходам навукоўцаў ад класавых крытэрыяў у ацэнках развіцця расійскага грамадства ў 1917 г., новым прадметам вывучэння становяцца пытанні сацыяльнай псіхалогіі ўдзельнікаў падзей 1917 г., асабліва сялян; у тым ліку ўплыў ментальных архетыпаў сялянскай абшчыны на іх настроі і паводзіны. Сярод іх – працы А.Г. Бухаўца, В.П. Булдакова, А.А. Вілкова, В.С. Поршневай і калектыўны зборнік "Анатомия революции 1917 год в России…"[25]. Асобныя даследаванні прысвячаліся актыўнасці сялянства ў валасных, зямельных і харчовых камітэтах, прычым, іх аўтары – С.Н. Арцёмаў, А.Н. Дзіндараў, М.Д. Жураўлёва, М.В. Оськін, Н.Е. Рагожнікава, С.Н. Туталмін і інш. падрыхтавалі свае працы на матэрыялах пэўнага края або нават губерні[26].

З набыццём Беларуссю суверэнітэту айчынная гістарыяграфія Лютага-Кастрычніка істотна не ўзбагацілася. Найбольшую, на той час увагу ў навуковай грамадскасці выклікалі публікацыі І.М. Ігнаценкі, якія адбівалі яго новыя падыходы да падзей 1917 г.[27] У той жа час, у характарыстыцы сялянскага руху аўтар застаўся на ранейшых пазіцыях, аб чым, у прыватнасці, сведчыць яго артыкул "Сялянства ў Лютаўскай рэвалюцыі", змешчаны ў II томе калектыўнай працы "Гісторыя сялянства Беларусі"[28].

Заўважым, што з пачатку XXI стагоддзя ў нашай краіне не з'явілася ніводнага твора (акрамя асобных прац, прысвечаных барацьбе беларусаў за дзяржаўнасць у 1917-1920 гг.[29]), дзе б знайшло аб'ектыўнае асвятленне сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча на Беларусі ў 1917 г. Па сутнасці, існуючыя ўяўленні аб Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях заставаліся нязменнымі[30]. Пэўныя намаганні па пераадоленні такога становішча прадпрыняў М.Я. Сяменчык[31]. Праўда, характарызуючы тагачаснае грамадска-палітычнае жыццё, ён толькі ўскосна закрануў яго сялянскі аспект без дэталёвага разгляду стаўлення вёскі да аграрнай і харчовай палітыкі. А.М. Сарокін у сваіх апошніх працах даў

---

[24] Друцкой-Соколинский В.Н. Записки губернатора.— Орел: Невероятный мир.— 1993.— 405 с.

[25] Анатомия революции 1917 год в России: массы, партии, власть. Сб. ст. / Под ред. В. Ю. Черняева.— Спб.: Глагол, 1994.— 444 с.; Булдаков В.П. Красная смута. Природа и последствия революционного насилия.— М.: РОССПЭН, 1997.— 376 с.; Вилков А.А. Менталитет крестьянства и российский политический процесс.— Саратов: Изд-во Сарат. ун-та, 1997.— 160 с.; Поршнева О.С. Менталитет и социальное поведение крестьянства, рабочих и солдат России в период первой мировой войны 1914—март 1918 гг.— Екатеринбург: УроРАН, 2000.— 414 с.

[26] Диндаров А.И. Земельные комитеты Среднего Поволжья в 1917—1918 гг.: Автореф. дис… канд. ист. наук: 07.00.02 / Казан. гос. ун-т.— Казань, 2002.— 20 с.; Рогожникова Н.Е. Аграрные преобразования в России в 1917—1920 гг. (По материалам Самарской губернии): Автореф. дис… канд. ист. наук: 07.00.02 / Тольятинский политех. инст-т.— Самара, 2000.— 22 с.; Журавлева М.Д. Крестьянство Среднего Поволжья в годы первой мировой войны: общественное сознание и социальное поведение: Автореф. дис… канд. ист. наук: 07.00.02 / Саранск. ун-т.— Саранск, 2001.— 21 с.; Оськин М.В. Государственная власть и крестьянство России в войне и деревни 1914 — октябрь 1917 гг.: по материалам черноземных губерний: Автореф. дис… канд. ист. наук.: 07.00.02 / Мос. гос. пед. ун-т.— М., 2003.— 22 с.

[27] Ігнаценка І.М. Аб змесце расійскіх рэвалюцый // Беларускі гістарычны часопіс.— 1994.— № 4.— С. 43—50.; Ігнаценка І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя: сутнасць і значэнне // Беларусістыка. Рэфератыўны зборнік. Вып. 3.— Мінск, 1994.— С. 142—157.; Ігнаценка І.М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі.— Мінск: Бел. НДЦДАС. 1995.— 270 с.; Игнатенко И.М. Октябрь без краски // Беларуская думка.— 1993.— № 11.— С. 65—69.

[28] Гісторыя сялянства Беларусі. Са старажытных часоў да нашых дзён: У 3 т. —Т. 2. Гісторыя сялянства Беларусі ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З.Е. Абезгауз, Х.Ю. Бейлькін, А.Р. Бухавец і інш. / Пад рэд. В.П. Панюціча.— Мінск: Бел. Навука, 2002.— 553 с.

[29] Багдановіч А.І. Праблема нацыянальнай дзяржаўнасці ў грамадска-палітычным руху Беларусі (сакавік 1917—студзень 1919 гг.): Аўтарэф. дыс… канд. гіст. навук: 07. 00. 01 / Бел. дзярж. ун-т.— Мінск, 1995.— 19 с.

[30] Урбанович А.А. Тактика политических партий Белоруссии в период подготовки и проведения выборов в Учредительное собрание: Автореф. дис. канд. ист. наук: 07.00.01 / Бел. гос. ун-т. Минск, 1993.— 20 с.; Шардыко И.В. Политические партии в борьбе за реализацию аграрного вопроса (на материалах Беларуси 1917-1918): Автореф. дис. канд. ист. наук: 07.00.01 / Бел. гос. ун-т.— Минск, 1993.— 25 с.

[31] Сяменчык М.Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917—сакавік 1918 гг.): У 2-х ч.— Ч. 1. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму.— Мінск: БДПУ імя М. Танка. 2001.— 200 с.

усебаковую характарыстыку сацыяльна-эканамічных праблем беларускай вёскі на савецкім этапе яе развіцця[32].

У той час, як расійскія аўтары, даследуючы 1917 г., звярнуліся да псіхалагічна-ментальных фактараў розных пластоў насельніцтва, канструктыўнай дзейнасці ўладных органаў у галіне эканомікі, асветы і г. д., у ацэнках гістарычных падзей у беларускай грамадскай думцы працягваюць дамінаваць, галоўным чынам, класава-партыйныя стэрэатыпы. А гэта, не адпавядае ні прынцыпам грамадскіх навук, ні вызначальным палажэнням ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Асноўную частку крыніц дысертацыі ўяўляюць матэрыялы фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у іх ліку Мінскага і Віцебскага губернскіх камісараў (616, 617 і 622), губернскіх харчовых камітэтаў (624 і 640) выкарыстанне якіх характарызуе харчовае становішча ў павятовых цэнтрах Беларусі. Значную навуковую цікавасць уяўляюць матэрыялы аб працы павятовых камісараў, зямельных камітэтаў (628, 751), харчовых (745) і земскіх упраў (620), акружных камісій па выбарах ва Устаноўчы сход (863). У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (далей – НГАБ) найбольш важныя для дысертацыі крыніцы запазычаны з фондаў губернскіх (1265, 2084, 2515), павятовых (670, 2086, 2089, 2090, 2091) земскіх упраў, харчовых і зямельных камітэтаў. Становішча сялянства найлепш прадстаўлена ў фондах Дзяржаўнага архіва Расійскай федэрацыі (далей – ДАРФ): канцылярыі Часовага ўрада (1778, 1779), Галоўнага зямельнага камітэта (1796) і Міністэрства ўнутраных спраў (1788). У фондах Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці захаваны звесткі аб правілах ажыццяўлення сельгаспадарчага і пазямельнага перапісу 1917 г.

Выключная інфарматыўнасць і шматграннасць у асвятленні жыцця вёскі ўласціва перыядычным выданням 1917 г. Пераважная іх большасць даследавана ў фондах НАРБ, НГАБ, а таксама Прэзідэнцкай, Нацыянальнай (Мінск) і Расійскай дзяржаўнай (Масква) бібліятэк. У прыватнасці, аб настроях, паводзінах сялян і іх удзеле ў арганізацыі ўладных структур, прадуктовых нарыхтоўках, барацьбе мясцовых (валасных і харчовых) камітэтаў з вінакурэннем, патравамі, захопамі прыватнай маёмасці і інш. Выкарыстаны ў дысертацыі газетны матэрыял, як правіла, верыфіцыраваны данымі архіва.

З апублікаваных зборнікаў дакументаў найбольш актыўна выкарыстоўваліся “Собрание узаконений и распоряжений Правительства”[33], “Труды ЦСУ. Т. 5. Вып. 2. Погубернские итоги Всероссийской сельскохозяйственной и поземельной переписи 1917 г.”[34]; “Сельское хозяйство России в XX веке. Сборник статистико-экономических сведений за 1901–1922 гг.”[35].

[32] Сарокін А.М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-ыя гады) / Сер. Гісторыя Бацькаўшчыны. Дадатак да часопіса “Права і Эканоміка”.— Мінск: Выд-ва Права і эканоміка, 1999.— 304 с.; Сарокін А.М. Рэха эпохі крайнасцяў. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917-1990-я гады).— Мінск: Выд-ва Права і эканоміка, 2005.— 303 с.

[33] Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За первую половину 1917 года.— Петроград. Сенатская типография. 1917.; Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За вторую половину 1917 года.— Петроград. Сенатская типография. 1917.

[34] Труды ЦСУ.— Т. 5. Вып. 2. Погубернские итоги Всероссийской сельскохозяйственной и поземельной переписи 1917 г. по 52 губерниям и областям.— М.: Госиздательство, 1921.— 87 с.

[35] Сельское хозяйство России в XX в. Сборник статистико-экономических сведений за 1901—1922 гг.— М.: Новая деревня, 1923.— 340 с.

У другой главе ***“Удзел сялянства Беларусі ва ўсталяванні і ўмацаванні новага ладу”*** разглядаецца роля і месца сялянства Беларусі ў стварэнні новых органаў дзяржаўнага кіравання, грамадска-палітычных арганізацыях, мерапрыемствах па збору сродкаў на карысць арміі і падпісцы на Пазыку Свабоды.

У першым параграфе “*Настроі і паводзіны сялянства Беларусі ў працэсе змены ўлады*” паказваецца рэакцыя вясковага жыхарства беларускіх губерняў на звесткі аб падзенні самадзяржаўя. З крахам дынастыі Раманавых, на Беларусі, як і паўсюдна па краіне, адбывалася ўсталяванне так званага “новага ладу”, па сутнасці, фарміраванне новай палітычнай сістэмы. У першыя дні сакавіка галоўным клопатам для былых чыноўнікаў дзяржаўнага апарату (акрамя губернатараў і іх намеснікаў, а таксама жандараў), служачых земстваў, гарадскіх самакіраванняў, Усерасійскага Земскага Саюза, Усерасійскага Саюза гарадоў, членаў Камітэтаў грамадскай бяспекі, Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі і іншых арганізатараў новага ладу з’яўлялася недапушчэнне сялянскіх выступленняў супраць чужой маёмасці і наогул парушэння грамадскага парадку, што пагражала зрывам сельгаспаставак на фронт і дэстабілізацыяй становішча на франтах. У выніку актыўнай, шматграннай і дзейснай прапагандысцкай працы ў беларускай вёсцы ў сакавіку-красавіку ўрадавым і грамадска-палітычным структурам удалося дасягнуць пастаўленых мэтаў. Стаўленне вяскоўцаў да звергнутага цара характарызавалася пераважна стрыманасцю, а да новай улады ў асобе Часовага ўрада – дабразычлівасцю і настроем аказваць яму падтрымку. Выпадкі асобных проціпраўных дзеянняў сялян маёмаснага кшталту былі выкліканы паслабленнем улады на пераходным этапе рэвалюцыі, але яны не былі ўласцівы беларускай вёсцы. У час Кастрычніцкай рэвалюцыі абвяшчэнне сялянства аб усталяванні Савецкай улады значна саступалі па часе, мэтах, формах, і дзейснасці, што ў, прыватнасці, адбілася ва ўзмацненні аграрных парушэнняў і пагаршэнні харчовага забеспячэння фронта і горада.

У другім параграфе “*Удзел сялянства ў фарміраванні органаў улады і самакіравання*” асвятляюцца асаблівасці ўдзелу вяскоўцаў у новых органах дзяржаўнай улады – валасных камітэтах, павятовых і губернскіх камісарыятах і ў земскіх выбарах. Ужо ў сакавіку намаганнямі дзяржаўных, грамадскіх і іншых установаў сялянам даводзілася аб неабходнасці ўдзелу ва ўмацаванні новай улады. Асобая роля ў сістэме новых органаў надавалася валасным камітэтам, якія мусілі замяніць сабой валасныя ўправы. Паводле ўрадавай інструкцыі, права ўдзелу ў выбарах атрымалі ўсе жыхары воласці, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту, без адрозненняў полу і г. д. Па меры актывізацыі сялянскіх Саветаў на чале з эсэрамі і іх партыйнымі суполкамі, жыхары вёсак сталі аказваць уплыў на склад павятовых і губернскіх камісарыятаў і нават здымаць з пасад камісараў. Так, з пачатку ўтварэння губернскіх камісарыятаў, у Мінскім было забяспечана сялянскае прадстаўніцтва ў колькасці не менш 30 %, якое з цягам часу зрабілася самым шматлікім. На неакупіраванай тэрыторыі Віленшчыны са стварэннем валасных камітэтаў быў абраны губернскі выканкам, у які ўваходзілі 16 сялян і рабочых. У Магілёўскай губ. таварышам камісара быў абраны

селянін К.Ф. Кусянкоў. У Віцебскім губернскім камісарыяце сялянства было прадстаўлена слабей, але яго інтарэсы актыўна адстойвалі салдаты.

З далейшай дэмакратызацыяй і палітызацыяй жыццядзейнасці грамадства, валасныя камітэты – сялянскія па свайму складу – не пазбягалі канфліктаў з існаваўшым заканадаўствам і спадзяваннямі Часовага ўрада. Выкарыстоўваючы валасныя камітэты, вяскоўцы дзялілі памешчыцкую зямельную уласнасць, замянялі ўрадавых камісараў і інш. У цэлым, спроба кардынальнага вырашэння праблемы дэзерцірства і вінакурэння сіламі саміх вяскоўцаў, з дапамогай валасных камітэтаў плёну не прыносіла і ў тагачасных умовах не мела станоўчай перспектывы. Характэрна, што гэта праблема прысутнічала ў парадку дня мясцовых органаў улады да апошніх дзён праўлення Часовага ўрада.

У адпаведнасці з урадавым рашэннем, пасля ажыццяўлення выбараў губернскіх, павятовых і валасных земскіх гласных, якія мусілі адбыцца ў жніўні-верасні 1917 г., валасныя камітэты і камісарыяты падлягалі скасаванню. Лепш за ўсіх да выбараў падрыхтаваліся на Магілёўшчыне, дзе выбарчая кампанія ў валасныя земствы пачалася з 15 жніўня, а ў павятовыя – з пачатку верасня; у Мінскай губ. – у верасні. У Віленскай губ., дзе земстваў да гэтага часу не існавала наогул, з-за адсутнасці адпаведнага вопыту выбары адбываліся са спазненнем. Яшчэ больш складаная сітуацыя ўзнікла ў Віцебскай губ., дзе выбары адбываліся аж у канцы кастрычніка. Падчас выбараў выявілася нізкая дасведчанасць сялян аб мэтах і працэдуры выбараў, а тайная форма падачы галасоў і галасаванне з дапамогай запісак выклікалі пратэсты і нават гвалт у дачыненні выбарчых камісій. Па партыйнай прыкмеце абраныя земскія гласныя ў большасці выпадкаў належалі да ПС-Р, Бунда, РСДРП; па сацыяльнай — да сялян.

У трэцім параграфе *"Сялянскія арганізацыі ў вырашэнні грамадскіх і дзяржаўных праблем"* разглядаецца ўзнікненне і дзейнасць сялянскіх грамадска-палітычных арганізацый. На пачатковым этапе станаўлення дэмакратычнага ладу, сялянства яшчэ заставалася пасіўнай у палітычных адносінах масай і не выказвала патрэбы ў іх стварэнні. Першыя арганізацыі — суполкі Сялянскага саюза і Саветаў сялянскіх дэпутатаў узніклі ў рэчышчы дэмакратычных пераўтварэнняў расійскага грамадства. На Беларусі іх арганізатарамі з'яўляліся, як правіла, урадавыя і земскія служачыя, інтэлігенты, вайскоўцы мясцовых гарнізонаў і інш., па партыйнай прыналежнасці ў пераважаўшай большасці — эсэры. У ліку першых камітэты Сялянскага саюза ўзніклі ў Гомелі і Мінску.

За рэдкім выключэннем, сяляне не выяўлялі вялікай цікавасці да дзейнасці Саветаў, у параўнанні з валаснымі або зямельнымі камітэтамі, і часцей разглядалі іх як сродак для вырашэння сваіх гаспадарчых пытанняў. У плане вырашэння дзяржаўных і грамадскіх праблем яны бралі ўдзел у фарміраванні органаў улады, харчовых і зямельных камітэтаў, барацьбе з дэзерцірствам і самагонаварэннем, зборы сродкаў на карысць фронта і інш. Дзякуючы намаганням урадавых і грамадскіх сіл з сакавіка па кастрычнік 1917 г. на Беларусі ўзнікла і дзейнічала каля 50 Саветаў сялянскіх дэпутатаў розных узроўняў. З прыходам да ўлады бальшавікоў Саветы сялянскіх дэпутатаў былі інтэграваны ў сістэму

дзяржаўнай улады і як самастойныя грамадска-палітычныя арганізацыі перапынілі сваё існаванне.

У чацвёртым параграфе *"Удзел беларускага сялянства ў зборы сродкаў на карысць арміі і падпісцы на Пазыку Свабоды"* разглядаецца ўдзел вяскоўцаў у зборы харчовых, грашовых і іншых ахвяраванняў для фронту і падпісцы на аблігацыі дзяржаўнай ваеннай пазыкі. З самага пачатку рэвалюцыі беларускае, як і ўсё расійскае сялянства, станоўча аднеслася да ўрадавага заклiку аб дапамозе франтавікам. У цэлым, па Расіі на патрэбу фронта з сакавіка да канца ліпеня быў ахвяраваны 1 232 681 пуд. хлеба. Нягледзячы на адносную абмежаванасць у сродках, беларускае сялянства актыўна ўдзельнічала ў гэтых мерапрыемствах, штомесяц ахвяруючы ад кожнай воласці па некалькі соцень пудоў хлеба і 200-300 руб. Каб папоўніць дзяржаўны бюджэт на ваенныя патрэбы, Часовы ўрад мусіў звярнуцца да практыкі правядзення дзяржаўных пазык і абвяўіў аб выпуску аблігацый Пазыка Свабоды на суму ў 3 млрд руб. Усяго з красавіка па кастрычнік было рэалізавана аблігацый на суму ў 4 043 млрд руб. пры 917 366 падпісчыках. Пры гэтым, у Расіі ахвотней на пазыку падпісваліся інтэлігенцыя і заможныя гараджане, а ў Беларусі — сяляне. Па меры зніжэння папулярнасці лозунгаў "вайны да пераможнага канца", "рэвалюцыйнага абароніцтва" пры адначасовым узрастанні антываенных настрояў дабрачынная дзейнасць сялянства да восені 1917 годы прыйшла ў заняпад.

У трэцяй главе ***"Сялянства Беларусі ў працэсе падрыхтоўкі да аграрнай рэформы і вырашэння харчовай праблемы"*** асвятляецца месца і роля сялянства ў ажыццяўленні аграрнай і харчовай палітыкі Часовага ўрада. У першым параграфе "*Галоўны і губернскія зямельныя камітэты ў падрыхтоўцы аграрнай рэформы (на матэрыялах Беларусі)*" раскрываецца дзейнасць і праца вышэйшых зямельных органаў краіны і іх уплыў на становішча з землеўладаннем і землекарыстаннем на Беларусі.

Прызнаючы неабходнасць вырашэння зямельнага пытання і адначасова ўлічваючы небяспеку пагаршэння харчовай сітуацыі ў краіне і зніжэння баяздольнасці расійскай арміі, якая магла ўзнікнуць ужо вясной, пад час перадзелу зямель, Міністэрства земляробства пад старшынствам А.І. Шынгарова 21 красавіка выдала пастанову аб заснаванні зямельных камітэтаў (галоўнага, губернскіх, павятовых, валасных). Ім ставілася ў абавязак вырашэнне зямельных спрэчак і збіранне матэрыялаў для аграрнай рэформы. На Беларусі, як і ў цэлым па Расіі, асноўную ролю ў стварэнні зямельных камітэтаў адыгралі ўрадавыя структуры. Характэрнай рысай валасных зямельных камітэтаў з'яўляўся іх пераважна сялянскі склад. Пасля зацвярджэння I Усерасійскім з'ездам сялянскіх дэпутатаў рэзалюцыі ад 25 мая аб перадачы ўсёй зямельнай уласнасці зямельным камітэтам, Міністэрства земляробства прадставіла ім права распараджэння пустуючымі зямельнымі ўгоддзямі, інвентаром, лясной маёмасцю і інш. Змест і рэалізацыя яго пастаноў ад 30 мая, 12 ліпеня (інструкцыя), 16 ліпеня, 10 кастрычніка, у прыватнасці, сведчылі аб непазбежнасці ліквідацыі памешчыцкага і інш. прыватнага землеўладання, а таксама фактычна распа-

чатай аграрнай рэформе ў адпаведнасці з зямельнай праграмай ПС-Р. Выданне ленінскага Дэкрэту аб зямлі, заснаванага на эсэраўскай аграрнай праграме, толькі дэкларавала асноўныя прынцыпы маючай адбыцца рэформы, але да канца лістапада 1917 г. так і не вырашыла яе.

У другім параграфе "*Сялянства Беларусі ва ўмовах зямельнай палітыкі Часовага ўрада і падрыхтоўкі да аграрнай рэформы*" асвятляецца жыццядзейнасць сялян у рэчышчы ўрадавай аграрнай палітыкі на чале з зямельнымі камітэтамі. На першых валасных сходах, мітынгах, а потым і на з'ездах сялянскіх дэпутатаў вяскоўцы пагадзіліся з адтэрміноўкай аграрнай рэформы да Устаноўчага сходу. У той жа час дэкларацыі Усерасійскага сялянскага з'езда, а таксама Віцебскай і Ковенска-Віленскай губ., як і ў выпадку з рэзалюцыяй сялянскага з'езда Мінскай губ. "Па зямельным пытанні", у шэрагу месцаў успрымаліся як дазвол на перагляд арэндных дагавораў з уласнікамі на новых умовах. Да гэтага часу на Беларусі (акрамя Віленскай губ.) дзейнічала 544 зямельных камітэтаў, у сваёй большасці ўзначальваемыя эсэрамі. Пад іх уздзеяннем сялянскія грамадствы яшчэ да Устаноўчага сходу карысталіся лясньімі, зямельнымі і іншымі рэсурсамі, якія знаходзіліся ў памешчыцкай, царкоўнай і інш. уласнасці. Пры гэтым арганізаваны сялянскі рух пераважаў над стыхійным. З прыходам да ўлады бальшавікоў зямельныя камітэты былі рэарганізаваны ў адмысловыя аддзелы сумесных Саветаў рабочых, салдацкіх, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў і прыступіліся да аграрнай рэформы.

У трэцім параграфе "*Харчовая палітыка Часовага ўрада і асаблівасці яе ажыццяўлення ў беларускай вёсцы*" разглядаецца роля і месца вяскоўцаў Беларусі ў харчовай палітыкі Часовага ўрада. Па сваёй важнасці харчовае пытанне не саступала аграрнаму і было цесна з ім звязана. У новых умовах яго вырашэнне залежала ад добрай волі землеўладальнікаў і хлебаробаў. З гэтай нагоды адбылося выданне ўрадавых пастаноў аб заснаванні харчовых камітэтаў (3 сакавіка), аб перадачы хлеба ў распараджэнне дзяржавы (25 сакавіка) і "Аб ахове пасеваў" (11 красавіка). Вырашэннем харчовай праблемы належала займацца валасным, павятовым і губернскім харчовым камітэтам. На першым этапе яе рэалізацыі (май-чэрвень) беларускае сялянства падтрымала хлебную манаполію і актыўна ўдзельнічала ў хлебанарыхтоўках. На другім этапе (ліпень-жнівень) пад час збору новага ўраджаю, з-за недароду, зрываў прадуктовых дзяржпаставак, уздаражання прамысловых прадуктаў і інш. у паводзінах вяскоўцаў адносна хлебных рэквізіцый выявілі перавагу ўласных інтарэсаў над грамадскімі. Нарэшце, з надыходам восені, калі эканамічны крызіс у краіне стаў узмацняцца палітычным, калі дзейнасць (або бяздзейнасць) валасных, зямельных і харчовых камітэтаў усё больш падпарадкоўвалася інтарэсам іх абраннікаў, харчовае пытанне на Беларусі і асабліва ў прыфрантавой зоне абвастрылася настолькі, што правал палітыкі Часовага ўрада ў гэтым пытанні стаў відавочным. З усталяваннем Савецкай улады харчовае пытанне па-ранейшаму заставалася ў ліку найбольш злабадзённых.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Дэмакратычны характар Лютаўскай рэвалюцыі абумовіў неабходнасць і магчымасць прыцягнення сялянства Расійскай дзяржавы, у тым ліку Беларусі, да вырашэння грамадска-палітычных і эканамічных праблем. Адносна хуткаму і бесканфліктнаму ўсталяванню новага ладу ў беларускай вёсцы вясной 1917 г. паспрыяла: па-першае, своечасовая і дзейсная мабілізацыя агітацыйна-прапагандысцкіх сіл і сродкаў; па-другое, выкарыстанне вопыту папярэдняй ідэйна-прапагандысцкай працы, скіраванай на абарону краіны; па-трэцяе, арыентацыя сялянства на вырашэнне яго праблем законным шляхам, праз склікание Устаноўчага сходу; па-чацвертае, апора на станоўчыя чалавечыя вартасці селяніна – законапаслухмянасць, патрыятызм, талерантнасць, міласэрнасць і інш. Сялянства Беларусі заявіла сябе прыхільнікам новага ладу ў асобе Часовага ўрада і яго мясцовых органаў, выказала гатоўнасць захоўваць парадак і забяспечваць харчовыя пастаўкі на фронт і ў горад. Пад час усталявання Савецкай улады падобных форм работы на вёсцы не назіралася, невыпадкова таму аграрныя правапарушэнні вылілся ў рабаўніцтва панскай маёмасці, а сялянскія пастаўкі для арміі фактычна перапыніліся [2, 5, 7, 8].

2. Лютаўская рэвалюцыя істотна памяняла сістэму кіравання краінай, наблізіўшы народ да ўдзелу ў ім. Ва ўмовах новага, дэмакратычнага рэжыму ўзаемаадносіны сялянства і ўлады перайшлі ў рэчышча супрацоўніцтва. Усе дзеездольныя сяляне атрымалі права абіраць і быць абранымі ў дзяржаўныя органы ўлады і самакіравання. Нягледзячы на законапаслухмянасць, у асноўным па прычыне неразвітай палітычнай культуры і невысокага ўзроўню адукацыі, беларускае сялянства выяўляла перавагу карпаратыўных (у межах сельскага грамадства) інтарэсаў над дзяржаўнымі і грамадскімі. Паслабленне дзяржаўнай улады і неразвітасць дэмакратычных інстытутаў узмацнялі магчымасці валасных выканаўчых органаў для злоўжыванняў на карысць іх выбаршчыкаў. Калі прысутнасць на выбарных пасадах першага складу значнай колькасці заможных элементаў тлумачылася адсутнасцю сялянскіх кандыдатаў, здольных выконваць кіруючыя функцыі, то ў далейшым "грамадзяне-земляробы" адносна хутка засвоілі карысць ад удзелу ў дзяржаўных установах і метадам перавыбараў пазбаўляліся ад непажаданых асоб. У земскіх выбарах выявілася асаблівая лінія паводзін вясковага грамадства з прыкметамі абшчыннай псіхалогіі (недавер да інтэлігенцыі і памешчыкаў, тайнага галасавання і інш.). Відавочна, што ўрадавыя сілы прыкладалі ўсе намаганні, каб сялянства мела магчымасць дэмакратычным шляхам скарыстаць права абіраць і быць абранымі ў органы самакіравання. Няма падстаў лічыць іх неўдзел у выбарах праявай антыўрадавых настрояў, бо абсентэізм быў з'явай, уласцівай не толькі вёсцы, але і гораду. Слабая актыўнасць выбаршчыкаў, незавершанасць павятовых земскіх выбараў, затрымка з фарміраваннем губернскіх земстваў – усё гэта і іншае не дазволіла пабудаваць на месцах трывалыя ўладныя структуры, каб спрыяць стабілізацыі мясцовага гаспадарчага жыцця і прадухіліць масавы сялянскі рух. Тым не менш як

абраныя дэмакратычным шляхам, яны карысталіся прыкметным аўтарытэтам у насельніцтва, і нават пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі працяглы час дзейнічалі паралельна з органамі Савецкай улады [1, 2, 7, 11].

3. У адрозненне ад рабочых або салдат сяляне Беларусі не выказвалі патрэбы ў стварэнні ўласных грамадска-палітычных арганізацый. Сялянскія арганізацыі – суполкі Сялянскага саюза і Саветы сялянскіх дэпутатаў узніклі па ініцыятыве грамадскіх, урадавых і партыйных дзеячаў, галоўным чынам, у мэтах перапынення аграрнага руху, дэмакратызацыі органаў улады, выканання пастаноў Часовага ўрада і яго мясцовых органаў і інш. З'яўляючыся часткай "рэвалюцыйнай дэмакратыі", сялянскія арганізацыі мусілі рухацца ў яе класавым рэчышчы. Па меры ўзнікнення, яны накіроўвалі сваіх дэлегатаў ва ўсе дзяржаўныя і буйнейшыя грамадскія аб'яднанні і набывалі магчымасць уплываць на іх палітыку. Як правіла, сялянства не выяўляла значнай зацікаўленасці да дзейнасці Саветаў, у параўнанні з валаснымі (выканаўчымі), зямельнымі і харчовымі камітэтамі, і часцей разглядала іх як сродак для вырашэння сваіх гаспадарчых пытанняў. У сваю чаргу кіраўнікі Саветаў выкарыстоўвалі іх для дасягнення сваіх партыйных мэтаў, маючы на ўвазе выбары ў земствы і Устаноўчы сход. Дзякуючы іх намаганням, да кастрычніка 1917 г. на Беларусі было створана не менш за 50 (губернскіх, павятовых, валасных) Саветаў сялянскіх дэпутатаў. Пасля перамогі Савецкай улады на Беларусі, Заходнім і Паўночным франтах Саветы сялянскіх дэпутатаў шляхам іх аб'яднання з Саветамі рабочых і салдацкіх дэпутатаў сталі ператварацца ў органы дзяржаўнай улады і як самастойныя грамадска-палітычныя арганізацыі перапынілі сваё існаванне [3, 7, 8, 14].

4. Намаганні Часовага ўрада па збору ахвяраванняў на Беларусі на карысць фронта знайшлі значную падтрымку сярод насельніцтва, асабліва сялянства. У рэалізацыі збору сродкаў на карысць арміі і ў фонд абароны арміі на вёсцы ўладныя органы выкарыстоўвалі пэўны вопыт самадзяржаўя. Пасля рэвалюцыі па меры дэмакратызацыі грамадства такая работа набывала палітызаваную афарбоўку, але гэтая акалічнасць у цэлым амаль не адбілася на настроях сялянства, якое яшчэ з пачатку вайны ўсвядоміла неабходнасць дапамогі сваёй арміі. Нягледзячы на тое, што беларускія губерні належалі да спажывецкага рэгіёну, іх аграрнае насельніцтва таксама ўдзельнічала ў пастаўках сельгаспрадукцыі для фронта і горада. Узросшая пасля звяржэння самадзяржаўя актыўнасць па дапамозе арміі была абумоўлена не толькі ўласцівасцямі псіхалогіі беларускага сялянства (міласэрнасць, чуласць), але і верай у станоўчае вырашэнне аграрнага пытання і набліжэнне міру. Відавочна, што ў прыфрантавой Беларусі Часовы ўрад у сваёй ваеннай палітыцы знайшоў нават большае спачуванне і падтрымку сялянства, чым у цэнтральных раёнах краіны. Тут Пазыка Свабоды па памерах рэалізаваных аблігацый пераўзышла пазыкі царскага перыяду. Сялянства беларускіх губерняў больш актыўна прымала ўдзел у падпісцы, чым іншыя пласты насельніцтва [4, 12, 14].

5. Сялянства Беларусі як і ўсёй Расійскай дзяржавы прыняла да ведама запэўніванні Часовага ўрада аб часе і ўмовах вырашэння зямельнага пытання і ў

цэлым выконвала ўсе патрабаванні яго мясцовых органаў. Вызначальнай прычынай, якая ўплывала на ўзрастанне аграрнага руху, з'яўлялася дзейнасць валасных зямельных камітэтаў, а таксама сялянскіх Саветаў на чале з эсэрамі. Сялянства рознымі метадамі імкнулася да паляпшэння свайго эканамічнага стану за кошт памешчыцкай і іншай маёмасці. Але, мяркуючы па глыбіні і маштабах аграрнага руху, гвалтоўны метад у ажыццяўленні іх мэт не быў вызначальным. Асноўны шлях у гэтым напрамку праходзіў праз выкарыстанне легітымных дзяржаўных устаноў (валасных, харчовых і зямельных камітэтаў), у першую чаргу на ўзроўні воласці. Шматлікія пастановы, загады, рэзалюцыі, якія траплялі "зверху" ў валасны, харчовы або зямельны камітэты, набывалі тэндэнцыйную інтэрпрэтацыю і выкарыстоўваліся ў інтарэсах сялянства. Нярэдка гэтыя ж органы выкарыстоўвалі прынятыя на сялянскіх форумах пастановы, якім вяскоўцы-абшчыннікі надавалі поўную юрыдычную сілу. Так, імкненне Часовага ўрада да рацыянальнага выкарыстання пасяўных плошчаў і дазвол на перадачу сялянам пустуючых зямель урэшце прывялі да таго, што працоўныя вёсак самастойна і нават праз абраныя камітэты сталі ладзіць перашкоды памешчыкам у выкарыстанні імі наёмнай рабочай сілы для апрацоўкі сваіх угоддзяў, каб пакінуць іх неапрацаванымі і тым фармальна абгрунтаваць свае правы на іх (угоддзяў) "асваенне". Разлік Часовага ўрада і грамадства на тое, што ўдзел сялянства ў зямельных камітэтах будзе ў поўнай меры садзейнічаць рэалізацыі ўрадавых праграм, асабліва ў пытаннях нарыхтоўкі прадуктаў харчавання для вайскоўцаў і гараджан, не апраўдаўся. У ажыццяўленні сваіх аграрных патрэб сялянства Беларусі аказвала істотны ціск на ўстановы, адказныя за іх рэалізацыю, у першую чаргу – на валасныя выканаўчыя і зямельныя камітэты. Гэтыя патрэбы не маглі не ўлічваць эсэраўскія кіраўнікі зямельных камітэтаў больш высокага рангу, а таксама іх таварышы па партыі з ліку камісараў. У выніку ўжо ў верасні-кастрычніку актуалізавалася патрабаванне арганізацый ПС-Р і падкантрольных ім Саветаў аб перадачы ўсёй уласніцкай зямлі ў распараджэнне зямельных камітэтаў. Ігнараванне Часовым урадам гэтай акалічнасці напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі і выбараў ва Устаноўчы сход у многім абумовіла страту ім падтрымкі з боку сялянства, у тым ліку і на Беларусі [1, 3, 5, 14].

6. З перамогай Лютаўскай рэвалюцыі ў першыя дні сакавіка адным з напрамкаў агітацыйна-прапагандысцкай работы на вёсцы з'яўлялася перакананне сялян у неабходнасці працягу ранейшых паставак прадуктаў на карысць фронта і горада. Як кіраўніцтва краіны, так і "рэвалюцыйная дэмакратыя" разумелі магчымасць хваляванняў на глебе харчовай нястачы, і таму імкнулася яе прадухіліць. Грамадская падтрымка Часовага ўрада надавала яму ўпэўненасць у магчымасці рэалізацыі харчовых нарыхтовак ва ўмовах абвешчанай ім хлебнай манаполіі. Кабінет Г. Я. Львова рэальна ацаніў яе значнасць для грамадства і дзяржавы, вызначыў прыцягальныя арыенціры для сялян (перамога ў вайне, скліканне Устаноўчага сходу, вырашэнне аграрнага пытання і інш.), забяспечыў абранне дэмакратычных выканаўчых органаў, маральны і практычны ўдзел усіх пластоў грамадства і г. д. Сялянства Беларусі са свайго боку выказала га-

тоўнасць выконваць пастаўкі па рэквізіцыях. Па сутнасці, харчовая палітыка Часовага ўрада набыла надкласавы, агульнадзяржаўны змест. Вясной-напачатку лета 1917 г. яна стымулявала рацыянальнае выкарыстанне зямельных плошчаў і здачу сялянскіх запасаў ураджаю мінулага года. У валасных харчовых камітэтах з моманту іх утварэння сталі пераважаць сяляне, а пасля арганізацыі губернскіх і павятовых сялянскіх Саветаў тэндэнцыя да поўнага выцяснення з харчовых камітэтаў, асабліва з іх упраў, прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп, рабілася вызначальнай. Натуральна, што і палітыка, якую ажыццяўлялі азначаныя ўстановы, стала праводзіцца з улікам інтарэсаў працоўнага сялянства. Тым не менш ужо вясной, нягледзячы на прыналежнасць беларускіх губерняў да спажываючых (а не вытворчых) губерняў, іх вясковае насельніцтва ўнесла значны ўклад у вырашэнне харчовай праблемы Расійскай дзяржавы на першым, самым складаным этапе ўсталявання ў ёй новага ладу. Разам з тым, паставіўшы на мэце ажыццяўленне хлебнай манаполіі, кабінет міністраў (асобна або разам з Міністэрствам земляробства, Міністэрствам харчавання, Ваенным міністэрствам і інш.) пераацаніў ступень усведамлення сялянамі яе грамадскай неабходнасці, бо як толькі выявіўся мясцовы недарод хлеба і знізіліся цэнтралізаваныя пастаўкі харчавання, беларуская вёска адрэагавала на гэта стыхійным ухіленнем ад хлебанарыхтовак. Невыпадкова ўрадавыя структуры мусілі выкарыстаць метады нават больш жорсткія, чым пры царызме: ад прымусовых рэквізіцый за палову цаны да крымінальнай адказнасці за тайны продаж збожжа або падачу недакладных звестак аб хлебных запасах. У той самы час агітацыйна-прапагандысцкі і рэпрэсіўны рэсурс у забеспячэнні хлебнай манаполіі не быў падмацаваны эканамічным (дэфіцыт прамысловых тавараў і іх высокі кошт, перабоі ў цэнтралізаваным забеспячэнні харчовымі прадуктамі і інш.). Намаганнямі харчовых камітэтаў удалося рэквізаваць новы ўраджай, але галоўным чынам, у маёнтках. Дробны ж уладальнік у сваёй масе вельмі неахвотна прадаваў сваю прадукцыю па цвёрдых цэнах, нават калі да таго заклікалі свае ж валасныя кіраўнікі або савецкія дзеячы. У выніку, летам-восенню продаж хлеба, фуражу і іншай прадукцыі дзяржаўным нарыхтоўчым службам не набыў масавага характару. Нягледзячы на велізарную прапагандысцкую і арганізацыйную работу Часовага ўрада па прыцягненні сялян да дзяржаўных спраў, камітэты розных узроўняў з іх удзелам не здолелі забяспечыць рэалізацыі абвешчанай манаполіі на ўраджай 1917 г. Гэта акцыя правалілася, але не з-за палітычных настрояў сялянства, а з-за ўзнікшай неадпаведнасці яго гаспадарча-эканамічных інтарэсаў патрэбам дзяржавы і астатняга грамадства. На зрыў хлебнай манаполіі і пагаршэнне забеспячэння арміі і горада сялянскімі прадуктамі істотным чынам паўплываў заняпад наступальніцкіх настрояў на фронце, а разам з ёй і патрыятычнага ўздзеяння на сялянства. Мала таго, па той жа прычыне знізіліся і паступленні ахвяраванняў з вёскі. У выніку нават для законапаслухмяных беларускіх сялян хлебная манаполія, па сутнасці, перастала быць абавязковай да выканання. Выкліканае, акрамя іншых фактараў, такімі іх паводзінамі абвастрэнне харчовага пытання істотна падрывала аўтарытэт Часовага ўрада, узмацняла сацы-

яльную напружанасць у беларускіх гарадах, на Паўночным і Заходнім фронтах і тым стварала глебу для чарговай рэвалюцыі. Невыпадкова, што франтавікі, якія засталіся без прадуктаў, ужо пасля звяржэння Часовага ўрада, былі вымушаны шукаць іх у панскіх і нават хутарскіх гаспадарках. У выніку органам Савецкай улады давялося займацца вырашэннем харчовай праблемы ў яшчэ больш складаных умовах [1, 5, 8, 13, 14].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы:**

1. Рыжанкоў І. М. Удзел сялянства Беларусі ў стварэнні і працы мясцовых органаў Часовага ўрада (вясна-восень 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. Выпуск XII.— Минск, 2004.— С. 103—109.

2. Рыжанкоў І. М. Уздзеянне рэвалюцыйных падзей на настроі і паводзіны сялянства Беларусі напачатку вясны 1917 г. // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. Выпуск XII.— Минск, 2004.— С. 110–112.

3. Рыжанкоў І. М. Аграрны рух і Саюз зямельных уласнікаў на Беларусі (сакавік-лістапад 1917 г.) // Сборник трудов молодых ученых Национальной Академии Наук Беларуси: В 5 т. / Ред. группа А. А. Ванин, И. Д. Карпенко и др.— Минск: ИП Логинов, 2004.— Т. 5.— С. 19—24.

4. Рыжанкоў І. М. Да пытання аб удзеле сялянства Беларусі ва ўмацаванні абароназдольнасці краіны пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі // Труды БГТУ. Сер. V. Политология, философия, история, филология. Выпуск XIII.— Минск, 2005.— С. 55—59.

5. Рыжанкоў І. М. Беларускае сялянства ва ўмовах падрыхтоўкі да аграрнай рэформы (сакавік—лістапад 1917 г.) // Весці Беларускага дзяржаўнага педагічнага універсітэта. Сер. 2. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, культуралогія.— 2006.— №1.— С. 8—12.

**Матэрыялы канферэнцый:**

6. Рыжанкоў І. М. Да пытання аб становішчы сялянства Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў працах айчынных гісторыкаў даваеннага перыяду // Гістарычнае пазнанне — важнейшая ўмова фарміравання светапогляду настаўнікаў XXI стагоддзя: Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 6 снежня 2002 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка.— Мінск, 2003.— С. 43—46.

7. Рыжанкоў І. М. Урадавая і грамадская палітыка ў беларускай вёсцы пасля Лютаўскай рэвалюцыі // Беларуская дзяржаўнасць: вопыт XX стагоддзя: Матэрыялы Міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі, Мінск, 18—19 красавіка 2003 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка.— Мінск., 2003.— С. 52—54.

8. Рыжанкоў І. М. Сялянства Магілёўскай губерні пасля Лютаўскай рэвалюцыі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: Зб. навук. прац удзельнікаў III Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Магілёў, 22—23 мая 2003 г. / Маг. дзярж. ун-т харч. Магілёў, 2003.— Ч. 1.— С. 275—284.

9. Рыжанкоў І. М. Сялянства Беларусі часоў рэвалюцый 1917 г. у працах І.М. Ігнаценкі // Сучасныя праблемы гістарыяграфіі гісторыі: Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Мінск, 28 лістапада 2003 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка.— Мінск, 2003.— С. 241—246.

10. Рыжанкоў І. М. Роля зямельных камітэтаў у ажыццяўленні ўрадавай палітыкі ў беларускай вёсцы (вясна—восень 1917 г.) // VIII Республиканская научно-техническая конференция студентов и аспирантов, “НИРС—2003”: Тезисы докладов, 9—10 декабря 2003 / Бел. гос. техн. ун-т.— Минск, 2003.— Ч. 6.— С. 154.

11. Рыжанкоў І. М. Да пытання аб удзеле сялянства Беларусі ў выбарах органаў мясцовага самакіравання (жнівень—лістапад 1917 г.) // XXI — век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы конференции посвященной 70-летию исторического ф-та БГУ, Минск, 15—16 апреля 2004 г. / Бел. гос. ун-т.— Минск, 2004.— С. 222—224.

12. Рыжанкоў І. М. Дабрачынная дзейнасць сялянства Беларусі на карысць арміі (сакавік—кастрычнік 1917 г.) // IX Республиканская научная конференция студентов и аспирантов Беларуси, “НИРС-2004”: Тезисы докладов, 26-27 мая 2004 г.— Гродно, 2004.— Ч. 1.— С. 73—74.

13. Рыжанкоў І. М. Тэндэнцыі развіцця сялянскай гаспадаркі Беларусі ва ўмовах аграрнай палітыкі Часовага ўрада // Актуальные проблемы новой и новейшей истории Европы и США: Материалы Республиканской научной конференции, 31 марта 2005 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка.— Минск, 2005.— С. 258—263.

14. Рыжанкоў І. М. Грамадска-палітычная актыўнасць сялянства Беларусі на пачатковым этапе разгортвання Лютаўскай рэвалюцыі // Першая Расійская рэвалюцыя: прычыны, ход, наступствы: Матэрыялы Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, 27 кастрычніка 2005 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т ім. М. Танка.— Мінск, 2005.— С. 131—134.

# РЭЗЮМЕ

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч**

**Сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем (сакавік — кастрычнік 1917 г.)**

**Ключавыя словы:** сялянства, Лютаўская рэвалюцыя, Часовы ўрад, валасныя камітэты, земства, сялянскія арганізацыі, ахвяраванні, Пазыка Свабоды, харчовае пытанне, хлебная манаполія, харчовыя камітэты, аграрная рэформа, зямельныя камітэты, аграрны рух, Дэкрэт аб зямлі.

**Аб'ект даследавання** — грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё народаў Расійскай імперыі (рэспублікі) у перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.

**Прадмет даследавання** — удзел сялянства Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

**Мэта даследавання** — комплекснае асвятленне і характарыстыка асноўных форм удзелу сялянства неакупіраванай кайзераўскімі войскамі Беларусі ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы з сакавіка па кастрычнік 1917 г.

**Метады даследавання.** У аснову даследавання пакладзена сукупнасць прынцыпаў гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці. Для комплекснага даследавання падзей і працэсаў у іх развіцці, паслядоўнасці, сувязі і пераемнасці выкарыстоўваліся канкрэтна-гістарычныя: праблемна-храналагічны, гістарычна-генетычны, апісальны, параўнальны, сістэмны, тыпалагічны, кантэнт-аналіз і агульнанавуковыя метады: індукцыі, дэдукцыі, сінтэзу, аналізу.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў гісторыі беларускай і замежнай гістарыяграфіі характарызуецца ўдзел сялянства Беларусі ў вырашэнні праблем грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця Расійскай дзяржавы на этапе падрыхтоўкі да Устаноўчага сходу і рэформ, звязаных з яго скліканнем. Усебакова раскрываецца ўдзел сялянства ў працэсе стварэння і дзейнасці органаў улады – валасных камітэтаў, камісарыятаў; харчовых і зямельных камітэтаў, грамадска-палітычных структур. Практычна ўпершыню асвятляецца ўдзел сялян у ажыццяўленні харчовай палітыкі, у мерапрыемствах па зборы сродкаў на карысць арміі і падпісцы на аблігацыі Пазыкі Свабоды.

**Тэарэтычнае значэнне** працы заключаецца ў раскрыцці на аснове сучасных метадалогіі і метадаў навуковага даследавання ролі беларускага сялянства ў вырашэнні грамадска-палітычных і эканамічных праблем Расійскай дзяржавы, пераадоленні палітызаваных стэрэатыпаў, устараненні прабелаў у гісторыі жыццядзейнасці сялянства ў рэвалюцыях 1917 г.

**Практычнае значэнне** — вынікі даследавання могуць прынесці карысць пры падрыхтоўцы краязнаўчых і энцыклапедычных выданняў, падручнікаў, метадычных дапаможнікаў, лекцый, спецкурсаў і семінараў для вышэйшай школы па гісторыі Беларусі і Расіі.

# РЕЗЮМЕ

## Рыжанков Игорь Михайлович

## Крестьянство Беларуси в решении общественно-политических и экономических проблем (март — октябрь 1917 г.)

**Ключевые слова:** крестьянство, Февральская революция, Временное правительство, волостные комитеты, земство, крестьянские организации, пожертвования, Займ Свободы, продовольственный вопрос, хлебная монополия, продовольственные комитеты, аграрная реформа, земельные комитеты, аграрное движение, Декрет о земле.

**Объект исследования** — общественно-политическое, социально-экономическое и культурное развитие народов Российской империи (республики) в период Февральской и Октябрьской революций 1917 г.

**Предмет исследования** — участие крестьянства Беларуси в решении общественно-политических и экономических проблем Российского государства с марта по октябрь 1917 г.

**Цель исследования** — комплексное освещение и характеристика основных форм участия крестьянства неокупированной кайзеровскими войсками Беларуси в решении общественно-политических и экономических проблем Российского государства с марта по октябрь 1917 г.

**Методы исследования.** В основу исследования положена совокупность принципов историзма, объективности и системности. Для комплексного исследования событий и процессов в их развитии, последовательности, связи и преемственности использовались конкретно-исторические: проблемно-хронологический, историко-генетический, описательный, сравнительный, системный, типологический, контент-анализ и общенаучные методы: индукции, дедукции, синтеза, анализа.

**Научная новизна.** Впервые в истории белоруской и иностранной историографии характеризуется участие крестьянства Беларуси в решении проблем общественно-политической и экономической жизни Российского государства на этапе подготовки к Учредительному собранию и реформ, связаных с его созывом. Всесторонне раскрывается участие крестьянства в процессе образования и деятельности органов власти – волостных комитетов, комиссариатов; продовольственных и земельных комитетов, общественно-политических структур. Практически впервые освещается участие крестьян в осуществлении продовольственной политики, в мероприятиях по сбору средств в пользу армии и подписке на облигации Займа Свободы.

**Теоретическое значение** работы заключается в раскрытии на основе современных методологии и методов научного исследования роли белорусского крестьянства в решении общественно-политических и экономических проблем Российского государства, преодолении политизированных стереотипов, устранении пробелов в истории жизнедеятельности крестьянства в революциях 1917 г.

**Практическое значение** — результаты исследования могут принести пользу при подготовке краеведческих и энциклопедических изданий, учебников, методических пособий, лекций, спецкурсов и семинаров для высшей школы по истории Беларуси и России.

## SUMMARY

**Ryzhankov Igor Mikhailovich**

**Peasantry of Belarus in the decision of social and political and economic problems (March — October, 1917)**

**Keywords:** peasantry, the February revolution, Provisional Government, volost committees, Zemstvo, peasant organisations, donations, the Loan of Freedom, food question, grain monopoly, food committees, agrarian reform, land committees, agrarian movement, the Decree on the Land.

**The object of research** is political, social and economic and cultural development of peoples of the Russian Empire (Republic) in the period of both the February and the October revolutions of the year of 1917.

**The subject of research** is participation of peasantry of Belarus in the decision of social and political and economic problems of the Russian state from March to October, 1917.

**The purpose of research** is complex displaying and characterizing the main participation forms of peasantry of Belarus not being occupied by kaiser troops in the decision of political and economic problems of the Russian state from March to October, 1917.

**Methods of research.** The research described has been carried out on the basis of principles of historicism, objectivity and systematic. For complex investigation of events and processes in their development, sequence, connection and continuity such specific historical methods as problem and chronological, genetic, descriptive, comparative, system, typological were used, along with general scientific methods of induction, deduction, synthesis, analysis, etc. The content-analysis method should be mentioned as well.

**Scientific novelty.** For the first time in Belarusian and foreign historiography participation of peasantry of Belarus in the decision of problems of a political and economic life of the Russian state at the stage of preparation for the Constituent Assembly and the reforms connected with its convocation is being investigated. Participation of peasantry in the process of forming and acting of such new authorities as volost committees, commissariats, food and land committees is being thoroughly exposed as well. Practically for the first time participation of peasants in the implying of food policy and in the actions on fund raising for the army and the subscription to the Loan of Freedom bonds has been displayed.

**Theoretical value of the research** is meeting blanks in history of peasantry in the revolutions of 1917, particularly in granting the opportunity to consider social behaviour of Belarusian peasantry from the point of view of modern methodology and to disclose its role in the decision of political and economic problems of the Russian state.

**Practical value.** The results of research can be used in preparation of study of local lore and encyclopedic editions, textbooks, educational and methodical manuals, lectures, special courses and seminars for the higher school on history of Belarus and Russia.



**Рыжанкоў** Ігар Міхайлавіч

**СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ВЫРАШЭННІ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ І ЭКАНАМІЧНЫХ ПРАБЛЕМ (сакавік — кастрычнік 1917 г.)**

Падпісана да друку 22.05.2006. Фармат 60×84 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Таймс. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,3. Ул.-выд. арк. 1,2.
Тыраж 100 экз. Заказ 324.

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт”.
220050, Мінск, Свярдлова 13а.
ЛИ № 02330/0133255 ад 30.04.2004.

Надрукавана ў лабараторыі паліграфіі ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт”.
220050, Мінск, Свярдлова, 13.
ЛП № 02330/0056739 ад 22.01.2004.